**Дарафей Фіёнік**
(Бельск-Падляшскі)

# Эвакуацыя царкоўнай маёмасці ў 1915 годзе і спробы яе вяртання пасля 1921 года на прыкладзе Беласточчыны

Праваслаўныя прыходы Беласточчыны, якія ў 1915 г. уваходзілі ў склад Гродзенскай епархіі, на пачатку жніўня таго ж года апынуліся пад непасрэднай пагрозай вайны. Пасля перамогі над расійскімі войскамі пад Варшавай (9 жніўня) нямецкія арміі даволі хутка пачалі перамяшчацца на ўсход. Для праваслаўнага насельніцтва Беласточчыны, даволі ўпэўненага ў сіле расійскай арміі, такая змена ходу падзей была зусім нечаканай.

Насельніцтва, пад псіхалагічным і часткова фізічным націскам, пачало рыхтавацца да эвакуацыі. Настаяцелі прыходаў, згодна з указаннямі Свяшчэннага Сінода і епархіяльнай улады, па меры магчымасці стараліся падрыхтаваць царкоўную маёмасць для вывазу.

Яшчэ ў лютым 1914 г. Гаспадарчы аддзел Свяшчэннага Сінода выдаў дырэктыву аб парадку эвакуацыі царкоўных прадметаў. Апрача святых мошчаў, цудатворных і іншых каштоўных ікон, царкоўнага начыння і званоў памечаны былі таксама гістарычныя, археалагічныя і мастацкія помнікі, старажытныя рукапісы, канцылярскія дакументы, маёмасныя акты ды метрычныя кнігі[1].

Як бачым, вывазу падлягала амаль уся храмавая і прыхадская рухомая маёмасць. Свяшчэнны Сінод стаяў на пазіцыі не дапус-

[1] Музей гісторыі і культуры Беларусі. Цыркуляр Мінскай духоўнай каністорыі „Всем учреждениям...” ад 12.08.1914 г.

ціць, каб што-колечы вартаснага трапіла ў рукі немцаў. Пры немагчымасці эвакуацыі іерархія раіла настаяцелям нішчыць усе дакументы і карэспандэнцыю, „беспаваротная страта якіх лепшая, чым захоп непрыяцелем”[2].

Як вынікае з пісьмовых крыніц, першачарговым прадметам эвакуацыі былі царкоўныя званы. Мелі яны стратэгічную вартасць і іх вываз быў арганізаваны амаль беззаганна. Знятыя са званіц званы завозіліся на найбліжэйшую чыгуначную станцыю, адкуль адпраўляліся ўглыб Расіі. Там найчасцей траплялі яны ў Маскоўскі артылерыйскі склад (напрыклад, званы з цакрквы ў Кленіках)[3] або іншыя царкоўныя ўстановы. Пяць вагонаў званоў трапіла ў Спасавы манастыр Харкаўскай губерні[4]. Магчыма, што знаходзіліся там таксама званы з падляшскіх цэркваў.

У акцыі эвакуацыі званоў прымалі ўдзел не толькі святары з прыхаджанамі, але і вайсковыя ўлады. Удзел першых быў, аднак, у многіх выпадках вырашальным. Так было, напрыклад, у выпадку званоў з царквы ў Кажанах над Нарвай. У апошніх днях ліпеня 1915 г. памёр тамашні святар а. Мікалай Весялоўскі. Перад бежанствам епархіяльныя ўлады не паспелі назначыць новага настаяцеля. Насельніцтва, пазбаўленае святара, перад выездам само вырашыла зняць чатыры званы і затапіць іх у старарэчышчы Нарвы[5]. Там яны ператрывалі вайну і пасля былі вылаўлены.

Наогул большасць званоў цэркваў Гродзенскай епархіі, у тым ліку і з Беласточчыны, былі вывезены ўглыб Расіі. Інакш было з астатняй царкоўнай маёмасцю. У гэтым выпадку святары, пазбаўлены дапамогі вайсковых улад, здадзены былі на саміх сябе і прыхаджан. Іконы, царкоўнае начынне, аблачэнні пакаваліся ў вялікай спешцы. Толькі частка спакаванага дабра была прынята на перавоз чыгункай, хаця колькасць царкоўнай маёмасці была надта вялікая. У жніўні 1915 г. на чыгуначным транспарце адчувалася дэзарганізацыя. У такой сітуацыі святары рашаліся браць з сабою толькі найбольш каштоўныя прадметы. Астатнія, супольна з даверанымі прыхаджанамі, закопвалі ў надзейных месцах, напрыклад, пад падлогамі ці сценамі храмаў, на царкоўных пляцах

2 Там жа.

3 Владимир Хлебцевич, *Село Кленики перед беженством — во время мировой войны*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne”, 1995, z. 2 (4), s. 142.

4 Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей: РДГА) у Пецярбургу. Дело о разрешении выдачи колоколов от 16.11.1917 г., ф. 769, оп. 445 (пералік дакументаў па эвакуацыі 1915 г., што знаходзяцца ў вышэйназваным архіве, памешчаны ў зборніку *Вяртанне*, т. II, Менск 1994).

5 Irena Matus, *Bieżeństwo z ikoną*, „Przegląd Prawosławny”, 1993, nr 10, s. 10-11.

і могілках. Пра месца захавання святары былі абавязаны паведаміць епархіяльныя ўлады[6].

Галоўным прадметам вывазу былі, вядома, святыя мошчы і асабліва шанаваныя іконы. На Беласточчыне да 1915 г. знаходзіліся мошчы св. Гаўрыіла Заблудаўскага ды некалькі цудатворных ікон: Супрасльская, Краснастоцкая, Гадышэўская, Бельская, Корнінская, Райская. Мошчы св. муч. Гаўрыіла ды ікона Супрасльскай „Адзігітрыі" ў пачатку жніўня 1915 г. былі адпраўлены з Супрасльскага манастыра ў Маскву. Мошчы былі памешчаны ў Пакроўскім саборы, а ікона — у храме „Няскучнага Спаса"[7]. Адсюль ікона ў Супрасль не вярнулася. Ікона Краснастоцкай Божай Маці і некалькі іншых каштоўных ікон з жаночага манастыра ў Краснастоку (Ружанымстоку) трапілі ў хатнюю царкву палаца ў Няскучным каля Масквы. Там жа памешчана было найбольш каштоўнае манастырскае абсталяванне[8].

Іконай Багародзіцы з Гадышэва ў жніўні 1915 г. заапекаваўся прыхадскі псаломшчык Ігнат Арлянскі, які на хвалі бежанства трапіў у сяло Ерамееўка Палтаўскай губерні. Ікона была памешчана ў тамашнім храме. Пасля вайны вярнулася яна ў ІІ Рэч Паспалітую, спачатку ў царкву Марыі Магдаліны ў Варшаве, а затым у Гадышэва — ужо ў касцёл[9].

Лёс бельскай іконы „Адзігітрыі" з Прачысценскай царквы ў час вайны няясны. Вядомым ёсць, што царкоўнае начынне з таго храма трапіла ў „Чудавы" манастыр у Маскве. Ці так было з іконай? Можна меркаваць, што святая выява асталася ў храме або была недзе пры ім схаваная. Не захаваліся ніякія пісьмовыя або вусныя звесткі пра вываз ці вяртанне іконы. Магчыма, што ў 1915-1918 гг. ікону, як і сам храм даглядала насельніцтва, якое па розных прычынах не выехала ў бежанства[10].

Лёсы Райскай і Корнінскай ікон да сёння невядомы. Іх выявы, у адрозненні ад Супрасльскай, не захаваліся нават у копіях. Асаб-

[6] РДГА, ф. 796, оп. 442. Извлечение из отчета архиепископа Михаила о состоянии Гродненской Епархии за 1915 г.

[7] Там жа.

[8] Там жа.

[9] ks. A. Roszkowski, *Hodyszewo. Opis historyczny parafii, kościoła i cudownego obrazu Najświętszej Marii Panny*, Łomża 1928, s. 39-40.

[10] У Бельску-Падляшскім і непасрэдным наваколлі горада пад нямецкай акупацыяй засталося каля ста няпоўных праваслаўных сем'яў. Такі лік можам акрэсліць на аснове даных з гарадскіх вёсак, у якіх у сярэднім засталося па 7 сем'яў (у Ягуштове — 8-10, у Відаве — 4-5), што дае агульны лік каля 40 сем'яў. У іншых вёсках з праваслаўным насельніцтвам магла быць падобная сітуацыя. Пакуль цяжка акрэсліць лік праваслаўных, якія засталіся ў самім Бельску.

ліва склаўся лёс іконы Багародзіцы з Кажан. Прыхаджане, пасля смерці настаяцеля перад самым бежанствам, самі вырашылі эвакуіраваць частку царкоўнай маёмасці. Вялікую памерамі ікону ўзяла з сабою сям'я Ільі Алексюка. Канчаткова трапілі яны ў Саратаўскую губерню. Там ікона была памешчана ў царкве ў Аткарску, а пасля ў Екацярынаўцы. Вяртаючыся на радзіму, сям'я Алексюкоў узяла з сабою таксама ікону. Яна шчасліва вярнулася ў Кажаны[11].

Эвакуацыя царкоўнай маёмасці часта адбывалася пад гул артылерыйскай перастрэлкі ды зарыва палаючых на захадзе вёсак. Такая абстаноўка сапраўды трывожыла і выклікала страх. Як напружаныя гэта былі дні, можам прасачыць на прыкладзе прыхода ў Грыневічах-Вялікіх, што каля Бельска-Падляшскага. 31 ліпеня (па старому стылю) 1915 г. святар а. Зіновій Чаквін адправіў з бельскай станцыі сем царкоўных званоў з грыневіцкай царквы[12]. У наступных днях святар з памочнікамі рыхтаваў для вывазу царкоўную ды дамашнюю маёмасць. 6 жніўня (якраз на свята Праабражэння Гасподняга — Спаса) жыхары Грыневіч і прыхадской вёскі Катлы падаліся ў бежанства. Праз два-тры дні на лініі ракі Белай затрымаўся нямецка-расійскі фронт. Некалькі дзён ішлі ўпорныя баі. У разгары бітвы апынулася грыневіцкая царква, якая стаяла на ўзгорку над ракою і служыла наглядальным пунктам для расіян[13]. 9 жніўня немцы выстралілі ў яе напрамку запальныя снарады і яна, як запісаў а. Зіновій Чаквін, згарэла „со всем находящимся в ней имуществом"[14].

Царква ў Грыневічах-Вялікіх — адзін са шматлікіх храмаў Гродзенскай епархіі, якія былі знішчаны або пашкоджаны ў выніку вайны. Архіепіскап Гродзенскі і Берасцейскі Міхаіл у інфармацыі пра стан сваёй епархіі за 1915 г. запісаў, што многія храмы епархіі вельмі пацярпелі ў час ваенных дзеянняў, а некаторыя былі разбураны расійскімі войскамі з тае прычыны, што маглі служыць зручным наглядальным або прыстрэльным пунктам[15]. На Беласточчыне такім чынам былі пашкоджаны або зусім знішчаны мураваныя цэрквы ў Райску і Патоцы каля Міхалова ды дряўляная ў Кляшчэлях. Трэба дадаць, што сур'ёзна пашкоджаны былі таксама касцёлы ў Ялоўцы і Мельніку.

[11] Irena Matus, dz. cyt.

[12] Архіў Прачысценскай царквы ў Бельску-Падляшскім. Главная опись Гриневицкой Свято-Илиинской Церкви и ея ризницы (...) составленная в 1892 г., с. 2.

[13] Сапрон Кавэрда, *Па разбураных мясцох Беларусі*, „Наша Думка", 1921, н-р 9, с. 4.

[14] Архіў Прачысценскай царквы ў Бельску-Падляшскім. Главная опись..., с. 1.

[15] РДГА, ф. 796, оп. 442.

* * *

Лёс вывезенай царкоўнай маёмасці з Беласточчыны склаўся драматычна. З часу бальшавіцкага перавароту ў Расіі ў 1917 г. актам варварства падвяргаліся многія царкоўныя ўстановы і храмы, у якіх перахоўвалася маёмасць, таксама із Гродзенскай епархіі. Так было ў выпадку „Патрыяршай Рызніцы” ў Маскве, якая на пераломе кастрычніка і лістапада 1917 г. была сур’ёзна пашкоджана. У сувязі з гэтым архіепіскап Гродзенскі стварыў спецыяльную парадкавую камісію[16]. Не лепшае, чым у Маскве, было становішча ў расійскай правінцыі, дзе разгульвалі банды розных чырвоных камісараў.

Рыжскі дагавор 1921 г., які вызначыў дзяржаўныя межы ІІ Рэчы Паспалітай і Краіны Саветаў, юрыдычна абумовіў вяртанне культурнай маёмасці, у тым ліку і царкоўнай. Апагей вяртання гэтай маёмасці наступіў у 1923 г. Вернутая царкоўная маёмасць, якая з Расіі найчасцей трапляла непасрэдна ў Варшаву, паводле польскіх законаў станавілася ўласнасцю дзяржавы, у якую яна вярнулася. Кур’ёзнай справай было тое, што прыходы, якія былі ўласнікамі маёмасці да 1915 г., атрымалі права „першакуплі” на яе. Можна гэта разгледзець на прыкладзе званоў.

Каб выкупіць свае званы, прыходы былі вымушаны плаціць немалыя сумы, якія дасягалі 4 500 марак за кілаграм. Для большасці прыходаў, у тым ліку закрытых, у паслябежанскім збяднелым становішчы такія кошты былі не пад сілу. З тае прычыны не ўдалося вярнуць званоў між іншым у царкву ў Райску[17]. Не быў гэта адзіны выпадак.

Наогул удавалася вяртаць званы багацейшым прыходам (калі, вядома, званы вярнуліся з Расіі). 4 ліпеня 1923 г. а. Зіновій Чаквін паведамляў з Крынак а. Васілію Кастыцэвічу з Прачысценскай царквы ў Бельску-Падляшскім, што званы з былой царквы ў Грыневічах знаходзяцца ў Варшаве[18]. У дадзеным выпадку званы ўдалося вярнуць у Бельск.

Варта адзначыць, што каардынатарам акцыі вяртання званоў цэрквам на Беласточчыне (відаць, таксама і ва ўсёй Заходняй Беларусі) быў пасол Сойма Сымон Якавюк (родам з падгайнаўскіх Дубін), які выступаў ад імені Беларускага пасольскага клуба. Пра гэта сведчаць інфармацыя з вышэйзгаданага ліста а. Зіновія Чаквіна ды дакумент, які захаваўся ў прыхадскім архіве ў Чорнай-Царкоўнай. 15 чэрвеня 1923 г. старшыня Беларускага пасольскага клу-

[16] РДГА, ф. 796, оп. 445.

[17] ks. Grzegorz Sosna, *Rajsk*, „Tygodnik Podlaski”, 1988, nr 2, s. 8.

[18] Архіў Прачысценскай царквы ў Бельску-Падляшскім. Ліст а. Зіновія Чаквіна а. Васілію Кастыцэвічу ад 4.07.1923 г.

ба Міхал Кахановіч паведамляў а. Пятра Кузмюка — настаяцеля царквы ў Чорнай-Царкоўнай: „З Расеі рээвакуіраваны званы Вашай царквы. Дзеля атрыманьня іх прышліця чалавека з „Уповажненем” у Варшаву, які павінен зьвярнуцца да пасла С. Яковюка”[19].

Прыведзеныя прыклады паказваюць, як складанай праблемай была справа вяртання прыходам іх маёмасці. З другога боку наглядаем, як актыўна палітычнае прадстаўніцтва беларускага народа ў першым Сойме II Рэчы Паспалітай садзейнічала Праваслаўнай царкве. Праблема гэтая, як і самая эвакуацыя царкоўнай маёмасці ў 1915 г. чакаюць яшчэ грунтоўнай гістарычнай распрацоўкі.

[19] Архіў царквы ў Чорнай-Царкоўнай. Паведамленне старшыні Беларускага пасольскага клуба настаяцелю Чарнянскай царквы ад 15.06.1923 г.